**Анатоль АСТАПЕНКА**
***Мінськ***

# ЗМЕНА ЭТНІЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЯЎ БЕЛАРУСАЎ У ЧАСЕ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎМАЦАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ Ў МАДЭРНУЮ ЭПОХУ

*В статті акцентовано увагу на тому, що вступ Білорусі в епоху інформаційних технологій вносить якісно нову парадигму формування білоруської культури і білоруської нації, так як у всьому світі розпочався якісно новий етап розвитку суспільства, пов'язаний зі стрімким розвитком інформаційних технологій, а час виникнення інформаційної революції, фактично, співпав з початком нової хвилі національного відродження і становлення білоруської державності. Зроблено висновок, що початок XXI століття застав білорусів в момент формування оновленої ментальності і вони переживають, можливо, найсприятливіший момент для формування своєї ідентичності, чого так не вистачало протягом століть.*

*Ключові слова: Інформаційна революція, ідентичність, білоруська нація, етнос.*

Уступленне Беларусі ў эпоху інфармацыйных тэхналогій, альбо наўпрост – у інфармацыйную эпоху – па выказванню Э. Кастэльса[1], ўносіць якасна новую парадыгму фармавання беларускай культуры і беларускай нацыі. Нам прыходзіцца жыць у полі універсальных каштоўнасцей, пераасэнасаўваць мультыкультурызм і фармаваць сваю нацыянальную ідэнтачныасць у якасна новым інфармацыйным грамадстве.

Яшчэ нядаўна беларуская нацыянальная парадыгма развівалася і фармулявался па іншым крэтыраям, у якасны іншых умовах.

Вось як характарызуе этнограф пачатку XX стагодзя Фядот Кудрынскі адну з найбольш характэрных асаблівасцей беларуса: «Одной из общих психических черт белоруса должно признать его недоверие к окружающим людям, кто бы они ни были. Эта слишком заметная черта в белорусе, можно сказать, лежит в основе всех его житейских отношений и составляет естественную форму его личнаго настроения…

Он охотно уступает пану «розум», а себе оставляет «хитрость», «каб не панский розум, та не наша хитрость – пропало б усе»… «Пана слухай, а свой разум май», говорит он, ограждая себя от всякаго влияния пана на свой быт»[2].

Трэба казаць, што гэтая якасць і праз сто год захвалася амаль нязменнай. На прэзідэнцкіх выбарах перамагае галоўны слоган: «Абы не было вайны». Беларус прымае любую парадыгму свайго існавання ў новым інфармацыйным грамадстве і па-ранейшаму імнецца толькі да аднаго – каб яго не чапалі. Ён паранейшаму «слухае пана» – дырэктыў ад начальства па любым жыццёвым і вызначальным пытанням, напрыклад, «за каго галасаваць». Праўда, гады сталінізму, за якія была вынішчана самая свядомая частка беларусаў, дадалі, а дакладней знішчылі з формулы Кудрынскага важкую частку: «свой розум май». Розум ужо не мае ранейшай аб'ектыўнай каштоўнасці. Ад яго застаўся хіба што нейкі сурагат сялянскай хітрасці, страху перад начальствам і брыдкага нацыянальнага нігілізму.

І таму ня дзіва, што гэтая абноўленая формула ментальнасці беларуса пачынае адкрыта культывавацца ў грамадстве і мы бачым «нацыянальных героеў» сучаснасці ў якасці кандыдатаў у прэзідэнты, якія выстаўлялі сваю кандыдатуру толькі для адной мэты: набыць сабе, так званы, палітычны багаж, і атрымаць за гэта сумнеўна «смачную костачку» ад заходняй дэмакратыі.


© Анатоль Астапенка

«Маўчы і будзь хітрым» – дае назву сваёй новай кніжцы сучасны беларускі пісьменнік, вельмі ўдала падкрэсліваючы змест сваіх апавяданняў, прысвечаных жыццю сучаснага беларускага грамадзяніна.

Вялікія змены ў грамадскім жыцці Беларусі і фармавання новай парадыгмы паводзін сучаснага чалавека, яго менатлітэту і тоеснасці, што адбыліся за апошнія два-тры дзесяцігоддзі, нельга разглядваць без аналізу галоўнай рысы новага часу – ўтварэння інфармацыйнага грамадства.

Прыкладна з 80-х – 90-х гадоў XX стагоддзя ўва ўсім свеце пачаўся якасна новы этап развіцця грамадства, звязаны з імклівым развіццём інфармацыйных тэхналогій. Персанальны кампутар і мабільны тэлефон змянілі сьвет на столькі, што новае пакаленне людзей, якое паспела вырасці ў гэтым новым інфармацыйным грамадстве якасна адрозніваецца ад сваіх бацькоў і гэта ўжо не праблема пакаленняў – гэтае адрозьненне на парадак большае ужо ад свайго бліжэйшага папярэдняга зьмянення.

У выніку згаданага якаснага скоку адбылася замена індустрыяльнага грамадства мінулага на новае – інфармацыйнае. Змены новай эпохі кранулі не толькі тэхналагічнай, матэрыяльнай, інфармацыйнай сферы. Гэтыя змены найболей уражлівыя як раз у вобласці мультыкультурнага дыскурсу і як вынік – ва ўзнікненні новага тыпу чалавека, якога завуць чалавек інфармацыйны [3] (Homo Informaticus).

Працэсы імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій прывялі да фарміравання новай парадыгмы грамадскіх працэсаў і пераўтварэння самога грамадства і нават трансфармацыі самой існасці чалавека. Адпаведна, к пачатку XXI стагоддзя металітэт беларусаў, які фармаваўся на працягу стагоддзяў перацярпеў вялікія змены і мы маем справу ўжо з новым чалавекам, які з дзіцячага садка, школы і інстытута ўбірае ў сябе новыя інфармацыйныя адносіны, інтэрнэт культуру, новыя камунікацыі – жыве ў адметна новым «інфармацыйным басейне». Калі зыходзіць з «хвалявай» канцэпцыі Э. Тофлера[4], альбо сінусаідальнай тэорыі Міколы Крукоўскага[5], то інфармацыйная рэвалюцыя супадае з «трэцяй хваляй» развіцця чалавецтва, якая замяніла індустрыяльную рэвалюцыю, вяршыня, «грэбень другой хвалі» (амплітуда сінусоіды) якой прыходзіўся на сярэдзіну XVIII – пачатак XIX стагоддзя. У сваю чаргу апошняя ўзнікнула як вынік замены «Першай хвалі» – сельскагаспадарчай рэвалюцыі, якая працягваецца ўжо тысячагоддзі.

У сувязі з гэтым не можа не здзіўляць тэмп паскарэння змены эпохаў і змены самой існасці чалавека. Апошняе змяненне – узнікненне новага тыпу чалавека – Homo Informaticus – адбывалася на вачах аднога пакалення. Людзі 50–60-гадовага веку, вымушаны былі працаваць, суіснаваць, у, рэшце рэшт, жыць з людзьмі зусім інакшага тыпу, інакшых вартасцяў, інакшага светапогляду і т. д. Узнікла новая праблема, зусім адрозная ад адвечнай праблемы бацькоў і дзяцей, што ўзнікае заўсёды пры змене пакаленняў. Змянілася парадыгма сэнсу жыцця, грамадзянскіх узораў і мэтаў грамадства. Капітал і праца саступілі месца інфармацыі і яе квінтысенцыі – веданню. У інфармацыйную эпоху большасць людзей сталі займацца ўжо не вытворчасцю матэрыяльных выгодаў, як у папярэдняе тысячагоддзе, а перапрацоўкай, захаваннем і выкарыстаннем інфармацыі. Узніклая цывілізацыя прывяла да новага тыпу стандартаў, скіравала грамадства за межы прагі да збірання грошай і прагі да ўлады.

Асновай фарміравання інфармацыйнага грамадствы стала развіццё вылічальнай тэхнікі – у першую чаргу асабовых кампутараў, а таксама камунікацыйных магчымасцяў, якія дала свету сусветная глабальная сетка – Інтэрнэт. Абмен інфармацыяй ужо не звязаны з існаваннем дзяржаўных межаў і іншых бар’ераў, у тым ліку моўных. Зараз самая маленькая і эканамічней слабая краіна можа ў вельмі сціслыя тэрміны стаць значнай інфармацыйна-індустрыяльной краінай. Прыкладам можа служыць шэраг краін Паўднёва-Заходняй Азіі (Паўднёвая Карэя, Тайвань і інш.), якія з’яўляюцца зараз магутнымі пастаўшчыкамі камп’ютэрнай тэхнікі і іншых сучасных тэхналогій для ўсяго свету. Ствараецца магчымасць паўнавартасна працаваць праз электронныя магістралі, навучальныя ўстановы і выкладчыкі становяцца досягальнымі да ўсіх

студэнтаў, а велізарны патэнцыял навукі, літаратуры і мастацтвы становіцца дасягальным для ўсіх жадаючых. Новая парадыгма складаецца ў тым, што амаль кожны чалавек інфармацыйнага грамадства становіцца інфармацыйным чалавекам нават калі ён гэтага не жадае!

Чалавек інфармацыйны літаральна раствораны у інфармацыйным асяроддзі, што азначае змену асяроддзя жыхарства сучаснага чалавека. Што ж прыўносіць гэтае новае асяроддзе жыхарства чалавека? Найбольш відавочна наступнае: разам са звышдаступнасцю інфармацыі ідзе працэс аддалення аднога індывіда ад другога фізічна. Яны становяцца не патрэбныя адзін аднаму, рэальныя зносіны ўсё больш замяняецца віртуальнымі зносінамі, захапліваючы нават такія інтымные вобласці як вобласць сэксу.

Такім чынам, новае асяродзе жыхарства чалавека ў інфармацыйным грамадстве фарміруе наступныя прынцыпы:

- працоўныя месцы з прадпрыемстваў пераносяцца ў дом. Дом становіцца цэнтральнай адзінкай будучага грамадства;

- грамадства будуецца па тыпу глабальнай сеткі, а не іерархіі арганізацый, дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў;

- грамадства будуецца па прынцыпу дэцэнтралізаціі і дэкампазіціі. Тым самым асноўныя прынцыпы тэорыі сістэм у поўнай меры становяцца рэальным механізмам прагрэсу.

Усё сказанае аб асяроддзі жыхарства інфармацыйнага чалавека непазбежна прыводзіць і да змены самой існасці чалавека, а значыць і яго менталітэту. Змяняюцца сацыяльна-культурныя ўзоры, мэты чалавека. Узнікаюць новыя і губляюць сваю прывабнасць старыя вартасці. Калі зусім нядаўна самое слова «навука» выклікала ў здольнага маладога чалавека пачуцце дрыжыкаў і глыбокую пашану, дык зараз гэтага няма. Навука з прыярытэтнага, элітнага занятку ператвараецца ў занятак руцінны, пазбаўлены ранейшага арэалу рамантыкі і прывабнасці. Значна больш цікавай вобласцю аплікацыі інтэлекту і здольнасцей з'яўляецца вобласць камп'ютэрных тэхналогій, дзе маюцца бясконцыя магчымасці, якія лёгка дасягаюцца кожным. Вектар інтарэсаў у навуцы за нейкія 20–30 гадоў істотна змяніўся. Калі раней праблемы такіх фундаментальных навук як фізіка элементарных часцінак і тэорыя рэлятыўнасці былі самымі перадавымі і атаесамліваліся з самымі выдатнымі людзьмі ХХ стагоддзя, такімі як Альберт Эйнштэйн і Нільс Бор, то цяпер прыярытэты дужа змяніліся. Для сучаснага маладога человека галоўным аўтарытэтам будзе ўжо Біл Гейтс, а не Эйнштэйн, а самым дзіўным адкрыццём будзе не «адзіная тэорыя поля», а самы танны мікрапрацэсар у выглядзе вельмі дробнага крышталю.

Змяненне вектару ў навуковых напрамках выклікала поўную структурную перабудову ў акадэмічных інстытутах і ў сферы адукацыі. Гэта ў сваю чаргу замацавала станаўленне новага тыпу человека – Homo Informaticus. Ранейшае «Я», якое яшчэ існуе ў людзях старэйшага пакалення паступова трансфармуецца ў новае «Я» інфармацыйнай эпохі. Усе нюансы характеру, псіхалогіі, імкненняў, вартасцяў гэтага новага чалавека яшчэ трэба вывучыць, але зразумела адно: мы маем справу з новай з'явай, з новым інфармацыйным чалавекам, які засяляе інфармацыйнае асяроддзе.

Цікавым з'яўляецца і суіснаванне разам з новым человекам інфармацыйнага грамадства, прадстаўнікоў старой фармацыі. Некаторыя з іх да канца сваіх дзён не прынялі новую субкультуру і новую шкалу вартасцяў. Яны спынілі актыўныя дзеянні і ціха «дажываюць» свой век. Іншыя ж прынялі правілы новай гульні і наклалі матрыцу інфармацыйнага грамадства на сваю старую ідэалагічную схему і ўяўленні, упісаліся ў новую парадыгму, спрабуючы, і часта з поспехам, прыўнесці і свой уклад, свой вартасны досled.

Вось тут мы й сутыкаемся з непазбежным анатаганізмам якасна іншых менталітэтаў: людзей «даінфармацыйнай» эпохі і сёняшняй папуляцыі – эпохі Інтэрнэту і IT-тэхналогій, чалавека Homo Informaticus.

Такім чынам, інфармацыйнае грамадства паклала пачатак фарміраванню новага, інфармацыйнага чалавека. Нашае «Я» трансфармавалося ў новую існасць з істотным адрозненнем ягонай ментальнасці ад ментальнасці чалавека індустрыяльнага грамадства.

Гэтыя новыя рысы ментальнасці яшчэ зусім не вывучаныя і часта не маюць нават свайго азначэння. Гэта і не дзіўна – новыя асаблівасці ментальнага характару ніколі не сустракаліся ў гісторыі і ня маюць аналагаў.

Мы назіраем новыя рысы беларуса XXI стагодззя, якасна адрозныя ад стагоддямі сфармаванага беларуса, апісанага ўжо згаданым Ф.Кудрынскім. Гэты беларус ўжо не маўклівы і недаверлівы селянін, зацяты ў сябе і разам з тым дагодлівы перад начальствам, а чалавек цывілізаваны – адкрыты, кемлівы, ведаючы сабе кошт і пахаваўшы свой адвечны страх, што быў цэнтральным чыннікам адмоўнага іміджу беларусаў сярод іншых нацый.

Пачатак XXI стагоддзя заспеў беларусаў можа ў момант фармавання абноўленай менатальнасці і, магчыма, мы перажываем найспрыльнейшы момант для стварэння сваёй ідэнтычнасці, чаго так не хапала цягам стагогоддзяў.

Эпоха інфармацыйнай рэвалюцыі рэзка мяняе дачыненні паміж людзьмі, мяняе менталітэт людзей і шмат што іншае. Дзякуючы сусветнай кампутарнай сетцы ўся земная куля імгненна пераўтварылася ў адзіную сістэму, законы якой розняцца ад ранейшых і вынікаюць з агульнай тэорыі сістэм. Цяперашнюю эпоху звязваюць з працэсамі глабалізацыі, сусветная супольнасць дзяржаў нават атрымала назву «сеткавыя грамадствы», што пераводзіць нашае існаванне ў свеце на якасна новы ровень».

Міжкультурны дыялог і міжкультурнае мысленне у новых умовах надае новыя магчымасці беларусам у галіне нацыянальнага будаўніцтва. Менавіта цяпер у нас з’явіліся унікальныя магчымасці да доследу самых розных культур і на гэтай аснове фармулявання асаблівасцей беларускагай ідэнтычнсці і завяршэння нацыяфармавання.

Важнай умовай існаваня беларускай нацыі з’яўляецца дзяржаўнасць. І з 1991 года Беларусь умацоўвае свой суверэнітэт, хаця сам працэс нацыянальнга будаўніцтва па вядомы прычынам ажыццяўляецца вельмі слаба. Аднак хараніць беларусаў як нацыю яшчэ рана.

Ясна, што ідэя дзяржаўнасці яшчэ не самадастатковая для канструявання беларускай нацыі. Яна толькі ўмова станаўлення, прагрэсу нацыі. Саму нацыю трэба перадусім стварыць. І гэты механізм трэба, відаць, пачынаць з нуля. Такі варыянт нацыяналізму ведамы як фінскі. Фінскую нацыю стварылі нацыянальныя ідэолагі ў канцы XIX ст. праз стварэнне фінскага міфа, які, сваім парадкам, праз адукацыю і асвету быў прынесены ў народ, і які паклаў пачатак нацыі.

На нашу думку, беларускую нацыю можна ствараць таксама з нуля. Але не рамантызаваць нацыю праз нейкага нацыянальныга генія, а ствараць яе праз шыранне легенды аб практычнасці нацыянальнага існавання, выгодах быць беларусам, наагул прыярытэтнасці беларускай ідэнтычнасці ў Беларусі што да іншых этнасаў, у прыватнасці, рускага.

Пачатак XXI стагоддзя заспеў беларусаў можа ў момант фармавання абноўленай менатальнасці і, магчыма, мы перажываем найспрыльнейшы момант для стварэння сваёй ідэнтычнасці, чаго так не хапала цягам стагогоддзяў.

Час узнікнення інфармацыйнай рэвалюцыі, фактычна, супаў з пачаткам новай хвалі нацыянальнага адраджэння і станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Дзякуючы сусветнай кампутарнай сетцы ўся земная куля імгненна пераўтварылася ў адзіную сістэму, законы якой розняцца ад ранейшых і вынікаюць з агульнай тэорыі сістэм.

Разам з развіццём міжкультурнай філасофіі не меньшы размах атрымаў і іншы працэс – адваротны. Існасць яго ў тым, што як ніколі ў людзей з’явілася імкненне да шукання тоеснасці. «Самасць», сваё «Я» набывае зараз першаступеннае значэнне. І сусветная кампутарная сетка, інтэрнэт – найлепшы сродак да здзяйснення беларускай ідэнтычнасці на справе. Тое, што рабілі некалі фіны «ўручную», пачынаючы сваю нацыю «з нуля» – хадзілі ў народ, вялі праз маладзенькіх настаўніц адукацыю сяла, і праз многія іншыя акцыі, цяпер можна ажыццявіць зусім іншым спосабам, практычна, не выходзячы, з дому. Усе гэтыя заданні паспяхова выканае Інтэрнэт. Больш таго, да адраджэння беларускай нацыі можа спрычыніцца амаль кожны. Кампутарызацыя, тэлекамунікацыі прачочваюцца зараз у кожны дом, у кожны горад, а неўзабаве прыдуць і ў кожую вёску.

І ўсё гэта дае нам выдатны шанец стварэння сваёй нацыі. Але каб гэты працэс не пайшоў «самацёкам», яго трэба цэнтралізаваць, распрацаваць шэраг заданняў і праектаў, што будуць працаваць на стварэне беларускай нацыі праз глабальную інтэрнэтаўску сетку, іншыя кампаненты інфармацыйнай эпохі.

---

[1] Кастельс Э. Информационная эпоха: экономика, общество и культура. – М., 2000. – 606 с.

[2] По матэрыялам http://www.russianresources.lt/archive/Vilnius/Kudrin_0.html.

[3] Абрамов М.Г. Человек и компьютер: от Homo Faber к Homo Informaticus // Человек. – 2000. – № 4. – С. 127–134.

[4] Тоффлер Э. Третья волна. – М., 1999. – 784 с.

[5] Крукоўскі М. І. Бляск і трагедыя ідэалу. – Мн., 2004. – 350 с.

*В статье акцентируется внимание на том, что вступление Беларуси в эпоху информационных технологий вносит качественно новую парадигму формирования белорусской культуры и белорусской нации, так как во всем мире начался качественно новый этап развития общества, связанный со стремительным развитием информационных технологий, а время возникновения информационной революции фактически совпало с началом новой волны национального возрождения и становления белорусской государственности. Сделан вывод, что начало XXI века застало белорусов в момент формирования обновленной ментальности и они переживают, возможно, самый благоприятный момент для формирования своей идентичности, чего так не хватало в течение столетий.*

*Ключевые слова: Информационная революция, идентичность, белорусская нация, этнос.*

*Belarus' entry into the information age introduces a qualitatively new paradigm of formation of the Belarusian culture and the Belarusian nation. A new stage of development of society began in the world that is associated with the rapid development of information technology. Time of occurrence of the information revolution, in fact, coincided with the beginning of a new wave of national revival and the formation of the Belarusian statehood. The beginning of XXI century Belarusians caught in the moment of the formation of the renewed mentality and we are going through perhaps the most auspicious moment for the formation of their identity, which was lacking for centuries.*

*Keywords: The information revolution, the identity, the Belarusian nation, ethnos.*